Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-06-14

# Форум — для навукі і рэлігіі

У Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя «Хрышчэнне Русі ў лёсах народаў Беларусі, Расіі, Украіны: выбар цывілізацыйнага шляху», прысвечаная 1025-годдзю хрышчэння Русі. У якасці арганізатараў гэтага прадстаўнічага форуму выступілі Інстытут гісторыі НАН Беларусі, а таксама Беларускі Экзархат Рускай Праваслаўнай Царквы.

**Юзэфа ВОЎК**

Падчас урачыстага адкрыцця міжнароднага форуму прагучала прывітальнае слова Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Яго зачытаў намеснік прэм'ер-міністра краіны Анатоль Тозік:

— Больш як тысячу гадоў хрысціянства фарміруе агульныя для ўсіх усходніх славян этычныя і эстэтычныя ідэалы, служыць асновай маральных і культурных традыцый. Сёння яно адыгрывае вялікую ролю ва ўмацаванні маральных асноў, пропаведзі адзінства, міралюбнасці і ўзаемадапамогі. Шматгранная дзейнасць праваслаўнай царквы нязменна знаходзіць водгук у беларускім грамадстве. Супрацоўніцтва дзяржавы і Беларускага Экзархата дае магчымасць сумесна рэалізоўваць гуманітарныя праекты, рэстаўрыраваць унікальныя старадаўнія святыні і будаваць новыя храмы.

— Хрышчэнне Русі, гэтая найважнейшая вяха царкоўнай і нацыянальнай гісторыі, стала пачаткам карэннага духоўна-культурнага пералому ў жыцці ўсходнеславянскіх народаў. Прыняцце праваслаўя далучыла нашы народы да вялікай скарбніцы візантыйскай культуры, садзейнічала развіццю пісьменства, мовы і літаратуры. Хрысціянізацыя Кіеўскай Русі стала важным фактарам развіцця дзяржаўнай арганізацыі і палітычнай культуры, прававых адносін і асветы, навуковай думкі і зараджэння нацыянальнай самасвядомасці і духоўнага пераўвасаблення людзей, — падкрэсліў акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук Аляксандр Каваленя.

Праца двухдзённага форуму, што прайшоў у Мінску, была скіравана на асэнсаванне ролі хрысціянства ў сучасным свеце, усведамленне царкоўнага і духоўна-маральнага адраджэння, што назіраецца ў грамадстве цягам апошніх дзесяцігоддзяў, разгляд адметнасцей адназначэння рэлігійных свят у сем'ях, а таксама аналіз асаблівасцей узаемадзеяння дзяржавы і царквы, розных аспектаў успрымання рэлігіі чалавекам XXI ст. Міжнародная навуковая канферэнцыя сталася своеасаблівым пачаткам, адкрыццём цэлага шэрагу юбілейных мерапрыемстваў, што пройдуць у розных гарадах нашай краіны.